ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 19 (881) | Аўторак, 13 снежня 1994г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НОВЫЯ СТАРШЫНІ ВЫКАНКОМАЎ

1-га снежня г.г. з раніцы ў памяшканні культурна-асветніцкага цэнтра Гомеля праходзіла дванаццатая пазачарговая сесія Гомельскага абласнога Савета народных дэпутатаў. Яна разгледзела арганізацыйнае пытанне. Па прапанове Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі, які затым выступіў з прамовай, старшынёй аблвыканкома абраны дырэктар арэнднага прадпрыемства "Шклозавод імя Ламаносава" Павел Уладзіміравіч Шыпук.

У той жа дзень адбылася пазачарговая сесія Гомельскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, у рабоце якой таксама прыняў удзел Прэзідэнт рэспублікі А.Р.Лукашэнка. І на гэтай сесіі было разгледжана арганізацыйнае пытанне. Старшынёй выканаўчага камітэта абраны Сяргей Васільевіч Шапавалаў, які да гэтага працаваў першым намеснікам старшыні гарвыканкома.

## НА СЕМІНАРЫ Ў ГОРАДЗЕ-ПАБРАЦІМЕ

Чацвёртага снежня рэйсавым лайнерам з Мінскага аэрапорта-2 у Францыю вылецелі рэктар нашага універсітэта акадэмік Л.А.Шамяткоў, першы прарэктар прафесар М.В.Селькін, дэкан факультэта падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ дацэнт А.У.Гаўрылюк. Яны ўдзельнічаюць у семінары па міжнароднай праграме "Тэмпус", які праходзіць у горадзе-пабраціме Клермон-Феран. Першыя яе вынікі і перспектывы на будучае, акрамя гамяльчан, абмяркоўваюць вучоныя і зацікаўленыя прадстаўнікі Францыі, Англіі і Германіі.

Больш падрабязана аб гэтым міжнародным семінары мы раскажам у адным з бліжэйшых нумароў нашай газеты.

## Імянныя стыпендыяты



На здымку: В.Сурыновіч.

## "МОВУ САВАЮ ЛЮБЛЮ"

**Гаворыць выдатніца вучобы Вікторыя Сурыновіч.**

Чатыры гады -- час у жыцці немалы, каб паспець зразумець, што для цябе галоўнае. Вікторыя Сурыновіч, студэнтка 4-га курса філалагічнага факультэта, сваё прадвызначэнне акрэсліла: вучыць беларускай мове, прывіваць любоў і павагу да яе ў падрастаючага пакалення. Яна будзе настаўніцай у школе і лічыць, што дзеці -- гэта тая выдатная глеба, на якой пасеяныя ёй зярняткі любві да матчынага слова дадуць добрыя ўсходы. А яна будзе старацца несці ім ўсю прыгажосць роднай мовы, якую, на жаль, не ўсе заўважаюць ці не хочуць гэтага рабіць. З набыццём жа дзяржаўнасці Рэспубліка Беларусь павінна клапаціцца аб тым, каб яе мова жыла і развівалася. Роля выкладчыка ў гэтым асабліва вялікая.

Выбар спецыяльнасці для Вікторыі не быў асабліва пакутлівым. Яна выдатна вучылася ў сярэдняй школе ў г.Рэчыцы, атрымала пасля яе заканчэння залаты медаль, удзельнічала ў абласной алімпіядзе вучняў па беларускай мове, на якой заняла прызавое месца. Гэта і падштурхнула да канчатковага выбару -- філалогія. І калі стала студэнткай ГДУ, яшчэ раз упэўнілася ў правільнасці зробленага кроку. Было цікава вучыцца, слухаць выдатныя лекцыі любімых выкладчыкаў --З.А.Рудакоўскай, В.К.Шынкарэнка і інш.

З першага курса -- на экзаменах толькі пяцёркі. Стараннасць студэнткі ацэнена па заслугах: яна -- Купалаўская стыпендыятка.

Т.НІКАЛАЕВА.

Фота У.Чысціка.

[ЮБІЛЯРЫ]

## НАДЫШЛА ПАРА СТАЛАСЦІ

У жыцці калектыву Гомельскага кааператыўнага інстытута першы дзень зімы быў знамянальнай падзеяй. Тут 1-га снежня адзначалі 30-гадовы юбілей. Спачатку ў Гомелі існаваў вучэбна-кансультацыйны пункт, затым філіял Маскоўскага кааператыўнага інстытута, а пасля стварэння належнай уласнай вучэбнай і матэрыяльна—тэхнічнай базы, укамплектавання высокакваліфікаванага прафесарска-выкладчыцкага саставу ўзнікла магчымасць адкрыцця самастойнага — адзінага ў Беларусі — інстытута для падрыхтоўкі спецыялістаў спажывецкай кааперацыі. За прайшоўшы перыяд выпушчана каля 15 тысяч кадраў для важнай народнагаспадарчай галіны. Аб гэтым гаварылася на ўрачыстым пасяджэнні вучонага савета інстытута.

У адрас юбіляра паступіла шмат віншаванняў ад яго выпускнікоў, прадпрыемстваў і арганізацый. Інстытуту-юбіляру быў уручаны прывітальны адрас і ад нашага універсітэта.

◆ ◆ ◆

У першы зімовы дзень свой паўвекавы юбілей адзначыў калектыў арэнднага мантажна-будаўнічага аб'яднання «Гомельпрамбуд». Гэта — вядучая будаўнічая арганізацыя Гомельшчыны. На яе рахунку — найбольшая колькасць узведзеных аб'ектаў не толькі ў нашым горадзе, вобласці, але і за іх межамі.

У адрас юбіляраў-будаўнікоў паступіла шмат віншаванняў. На ўрачыстым сходзе прывітальны адрас быў уручаны і ад калектыву нашага універсітэта.

# ІСПАНІЯ: КРАІНА ВЯЛІКІХ УРАЖАННЯЎ

**У кастрычніку гэтага года ў Іспаніі амаль два тыдні знаходзіўся ў навуковай камандзіроўцы рэктар нашага універсітэта прафесар Л.А.Шамяткоў. Ён быў запрошаны універсітэтамі гарадоў Валенсія і Памплона, якія ўзялі на сябе ўсе расходы па гэтай камандзіроўцы, уключаючы кошт авіябілетаў. Сёння Леанід Аляксандравіч дзеліцца сваімі ўражаннямі аб гэтай паездцы.**

## СУСТРЭЧА З ВАЛЕНСІЯЙ

"Для Вас, як і любога іншаземца, упершыню прыехаўшага ў нашу краіну, Іспанія -- гэта карыда, кастаньеты, фламенко, гітара і смуглыя іспанцы. Але Іспанія шматлікая і шматгранная. Акрамя іспанцаў, якіх, канешне, большасць (каля 3/4), тут жывуць баскі, каталонцы, галісійцы са сваёй культурай і сваёй мовай, якая прызнана другой афіцыйнай мовай: у Каталоніі -- гэта каталонская, у Басконіі -- гэта баскская, а другая афіцыйная мова Галісіі называецца гальега". Так гаварыў мне з усмешкай прафесар Луіс Эсквера, калі зайшла гутарка аб характэрных рысах Іспаніі і іспанцаў. У справядлівасці яго слоў я ўпэўніўся ў першы ж дзень знаходжання ў Валенсіі -- буйным горадзе /800 тыс. жыхароў/ на ўсходзе Іспаніі, на беразе Міжземнага мора. Назіраючы за шумным натоўпам студэнтаў, я адзначыў пра сябе, што твары ў іх сапраўды розныя: акрамя смуглых ёсць вельмі смуглыя, а ёсць і вельмі бледныя. Але ўсе -- вельмі жыццярадасныя, рухомыя, шумныя. Ва універсітэцкай сталовай, як і ў нас, самаабслугоўванне. Прафесары і студэнты стаяць у адной чарзе. Запоўніўшы паднос і расплаціўшыся /абед каштуе 500 песет, гэта каля 4 долараў/, садзімся за столік. Вакол -- шум, крыкі, песні. Вось за ссунутымі сталамі сядзіць вялікая група студэнтаў-рабят, усе ў нацыянальных касцюмах і з гітарамі, спяваюць народныя песні пад пахвальныя воклічы акаляючых. Вельмі весела.

Але бачыў я і сумныя твары. Я прыляцеў у Валенсію вечарам 16 кастрычніка. У аэрапорце мяне сустрэлі прафесары Адольфа Балестэр-Баліншэ і Марыя Далорэс Перац-Рамош. У іспанцаў двайныя прозвішчы -- першае прозвішча бацькі, другое -- маці. Гэта спрыяльна, калі прозвішча вельмі распаўсюджана. Прафесар Эсквера носіць толькі прозвішча бацькі, таму што яно рэдкае.

Дык вось, у першы ж вечар мяне павялі вячэраць у кафэ, якое знаходзілася прама на вуліцы. Да нас падышла нядрэнна апранутая маладая жанчына з двухгадовым дзіцём на руках і стала прасіць міласціну. Мае іспанскія калегі былі вельмі збянтэжаны і сталі наперабой мне тлумачыць, што зараз у Іспаніі кошт жыцця высокі, шмат беспрацоўных, моладзі цяжка знайсці працу. Пазней я бачыў нямала маладых людзей, якія прасілі міласціну каля цэркваў, магазінаў, на рынку. У адрозненні ад "нашых" жабракоў яны не апранаюцца ў рыззё, выглядаюць знешне даволі прыстойна, але вочы сумныя, патухлыя.

## ПРА УНІВЕРСІТЭТ, ЯГО СТУДЭНТАЎ І ВЫКЛАДЧЫКАЎ

У Іспаніі вельмі шмат студэнтаў. Ва універсітэце Валенсіі прыкладна 30 тыс. студэнтаў. Акрамя стандартнага набору факультэтаў /фізіка, матэматыка, гісторыя, філалогія і інш./ ёсць асобны факультэт псіхалогіі, вялікі медыцынскі факультэт. Я спытаў у сваіх калег, колькі студэнтаў прымаюць на першы курс матэматычнага факультэта. Мне назвалі ашаламляльную лічбу: 350. Але ўладкавацца на працу пасля заканчэння універсітэта вельмі і вельмі цяжка, нават настаўнікам у школу. Я доўга думаў над гэтым парадоксам і прыйшоў да такога вываду. Па ўсёй верагоднасці, іспанскае кіраўніцтва добра разумее, што ёсць толькі два шляхі: або моладзь пасля школы папоўніць армію беспрацоўных і злачынцаў, а значыць, трэба будаваць дадаткова турмы і павялічваць колькасць паліцэйскіх. Або ёсць іншы шлях, больш выгадны для грамадства і нават больш танны: будаваць універсітэты і даць моладзі шанц выжыць у канкурэнтнай барацьбе.

У іспанскіх універсітэтах вучацца 4 гады, а сярэднюю школу заканчваюць у 18 гадоў. Навучальны год пачынаецца 1 кастрычніка і заканчваецца 1 ліпеня. У лютым і чэрвені -- экзаменацыйная сесія. Уступныя экзамены праводзяцца ў чэрвені і верасні, так што тыя, хто "праваліўся" адзін раз, могуць "выпрабаваць лёс" у другі. Выкладчыкі маюць толькі адзін месяц водпуску -- жнівень. Умовы работы выкладчыкаў цудоўныя: кожны мае асобны рабочы кабінет з камп'ютэрам, тэлефонам і неабходнай літаратурай. Але і нагрузка вялікая. Напрыклад, запрасіўшыя мяне мае калегі прафесары-алгебраісты мелі да 10 гадзін лекцый у тыдзень. Дарэчы, камп'ютэр, акрамя іншага, выкарыстоўваецца для прыёму электроннай пошты. У першы ж дзень майго прыезду на экра-



не камп'ютэра высвеціліся два пісьмы. Адно ад амерыканскага прафесара Бектэлы, які віншаваў іспанцаў з тым, што ім удалося запрасіць мяне ў Іспанію. Другое пісьмо з віншаваннем для мяне было ад нямецкага прафесара Дзёрка.

Трэба сказаць, што з іспанскімі калегамі я быў знаёмы раней толькі па перапісцы. Іспанцы добра ведалі, што ў Гомелі ёсць буйная алгебраічная школа. Больш таго, у апошнія гады аказалася, што гомельскія і іспанскія алгебраісты працуюць над аднымі і тымі ж праблемамі. Работы іспанскіх алгебраістаў мы ведалі, яны напісаны на англійскай мове. Нашых жа навуковых прац іспанцы амаль не ведалі, так як руская мова для іх — усё роўна што кітайская. Таму кожны дзень я вымушаны быў задавальняць цікаўнасць маіх іспанскіх калег. Звычайна справа адбывалася так. Прыкладна ў 11 гадзін раніцы за мной у гасцініцу заязджаў на сваёй машыне прафесар Балестэр-Баліншэ, і мы ехалі ва універсітэт. Каля універсітэта доўга даводзіцца шукаць месца для паркоўкі. Затым Адольфа добра замыкаў машыну /замыкаў руль спецыяльным прыстасаваннем, хаваў рэчы далей ад вачэй, нават здымаў і ўносіў з сабой пярэднюю панэль аўтамагнітолы/. Са збянтэжанай усмешкай тлумачыў мне, што ў Валенсіі вельмі высокі ўзровень злачыннасці, раіў мне позна вечарам не гуляць на вуліцы, так як гэта нават небяспечна для жыцця. Да самага абеду на працягу дзвюх гадзін я расказваў аб гомельскіх выніках выкладчыкам -- членам дэпартамента алгебры матэматычнага факультэта. Гэта назва адпавядае нашай кафедры, але паколькі ў іх наборы студэнтаў вялікія, то на іх "кафедры"-дэпартаменце працуе 35 чалавек. Пасля абеду -- яшчэ 2-3 гадзіны сумеснай навуковай працы. І так кожны дзень. Толькі ў чацвер да абеду і ў суботу /ва універсітэце гэта выхадны/ я быў свабодны і змог не спяшаючыся агледзець горад, пабываць у музеі, дзе ёсць цудоўныя карціны Гойя, Мурыльё, гравюры Піранэзі. Дарэчы, уваход у музей бясплатны. Акрамя штодзённых гутарак, на працягу тыдня майго знаходжання ў Валенсіі я зрабіў два афіцыйныя навуковыя даклады для ўсіх выкладчыкаў факультэта. Аб'явы аб гэтым віселі нават у ліфтах. Абмен навуковай інфармацыяй і сумесная навуковая работа былі вельмі інтэнсіўнымі. Урэшце, я заслужыў пахвалу. Звычайна, як яны сказалі, іншаземцы, якія прыязджалі ў Валенсію, стараліся менш працаваць, а больш піць віно і забаўляцца, а вы шмат і прадуктыўна працавалі.

## З ПОЎДНЯ -- НА ПОЎНАЧ

У нядзелю 23 кастрычніка мяне пасадзілі на аўтобус, і я паехаў на самую поўнач Іспаніі ў невялічкі гарадок Памплону. Гэта сапраўды невялікі /180 тысяч/, але вядомы горад, заснаваны ў І-м стагоддзі да новай эры рымскім палкаводцам Пампеем Вялікім /адсюль і назва горада/. У гэтым невялікім гарадку, дзе любіў бываць Хэмінгуэй, два універсітэты. Адзін вялікі прыватны універсітэт царквы з 25-ю тысячамі студэнтаў. Другі універсітэт /10 тысяч студэнтаў/ -- дзяржаўны, ён адкрыты ўсяго толькі 6 гадоў назад. За гэты кароткі час на зусім свабоднай пляцоўцы ў 200 га ў рысе горада пабудаваны ўсе неабходныя карпусы універсітэта. Асабліва ўражвае будынак бібліятэкі, дзе ў чытальнай зале на 600 месцаў вышыня столі з чатырохпавярховы дом!

У Іспаніі амаль усе універсітэты дзяржаўныя. Прыватных каля 4 або 5 на ўсю краіну, і ў іх кожны студэнт у год плаціць да 10 тысяч долараў. У дзяржаўных жа універсітэтах студэнт плаціць у год 500-600 долараў, што складае, канешне, толькі частку ўсіх расходаў на навучанне.

У Памплоне я працаваў са сваімі калегамі так жа інтэнсіўна, як і ў Валенсіі. Зрабіў і тут два афіцыйныя даклады, паслухаць якія прыехалі нават выкладчыкі з Сарагоскага універсітэта. Мне надарылі... мноства водціскаў навуковых прац, цэлых паўчамадана. Гэта навуковая інфармацыя для гамяльчан будзе вельмі важнай. Агульнавядомы сумны факт: зараз Беларусь адарвана ад сусветнай навуковай інфармацыі.

## РАЗВІТАННЕ

Я адлятаў з Іспаніі ў пятніцу 28 кастрычніка. З раніцы ліў дождж, пасля абеду апусціўся туман. Рэйс самалёта затрымліваўся. Прафесар Эсквера, які мяне праводзіў, пажартаваў, што прырода плача і не адпускае госця. У чаканні пасадкі на самалёт прафесар Эсквера запытаўся ў мяне аб палітычным і эканамічным становішчы ў Беларусі. Затым ён нечакана сказаў: "На Захадзе вельмі засмучаны тым, што распаўся Савецкі Саюз, краіна, дзе не было прыватнай уласнасці. Само існаванне сацыялістычнай сістэмы, СССР аказвала моцны ўплыў на заходнія краіны, прымушала больш клапаціцца аб простых людзях. Зараз заходняе грамадства ўзяло крута курс ўправа. І хаця мы грошай атрымліваем больш за вас, мы не адчуваем сябе шчаслівымі".

А карыду мне не ўдалося паглядзець. Гэта свята бывае толькі летам і працягваецца ўсяго тыдзень.

# БЕЛАРУСКА-ІТАЛЬЯНСКАЯ ПРАГРАМА

У нашым універсітэце адбылося адкрыццё сумеснай беларуска-італьянскай праграмы па стварэнню псіхалагічнай службы Гомельскай вобласці і падрыхтоўцы для яе кадраў. У аўдыторыі сабраліся студэнты і выкладчыкі ГДУ, слухачы факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, дырэктары школ-інтэрнатаў і дзіцячых дамоў, урачы-псіхіятры.

З уступным словам выступіў рэктар універсітэта акадэмік Л.А.Шамяткоў. Ён падкрэсліў, што падрыхтоўка псіхолагаў для нашага рэгіёна надзвычай актуальная. Па-першае, у Гомелі, ды і наогул у Рэспубліцы Беларусь, кадры псіхолагаў да апошняга часу не рыхтаваліся. Таму прафесійных псіхолагаў у нас вельмі мала. Па-другое, насельніцтва Гомельшчыны, і асабліва дзеці, маюць патрэбу ў псіхалагічнай дапамозе пасля чарнобыльскай катастрофы.

Складаная сітуацыя выклікала ініцыятыву кіраўніцтва універсітэта пры асабістым садзейнічанні дырэктара дэпартамента псіхолагаў прафесара універсітэта г.Пізы /Італія/ Гаэтана Барлетта пачаць летась гадавую перападрыхтоўку настаўнікаў і выхавальнікаў школ-інтэрнатаў і дзіцячых дамоў у якасці псіхолагаў. Асноўным заказчыкам на гэтыя кадры стала абласное упраўленне адукацыі.

Узаемадзеянне зацікаўленых бакоў у накірунку перападрыхтоўкі настаўнікаў запатрабавала паглыблення важнай работы. Гэта адлюстроўваецца ў часовым плане /адкрываемая цяпер праграма разлічана на тры гады/ і ў якасных адносінах: сёння для чарнобыльскага рэгіёна патрэбны не толькі школьныя псіхолагі, але і сацыяльныя, клінічныя псіхолагі, сацыяльныя педагогі.

ГДУ ўпершыню ў гісторыі свайго існавання ўзяўся за навучанне студэнтаў новай спецыяльнасці. Праўда, тут ёсць пэўныя цяжкасці, звязаныя з дэфіцытам уласных кадраў, адсутнасцю неабходнага псіхалагічнага абсталявання, методык, тэстаў і інш.

Улічваючы доўгатэрміновы характар чарнобыльскіх праблем, а значыць і адпаведнай неабходнасці грамадства ў кадрах псіхолагаў, гаварыў Л.А.Шамяткоў, разлік робіцца на плённае супрацоўніцтва з псіхолагамі г.Пізы, на ўзаемавыгадныя адносіны паміж Гомельскім і Пізанскім універсітэтамі. Ускладваюцца вялікія спадзяванні на дапамогу італьянскіх псіхолагаў у наданні новага зместу універсітэцкай псіхалагічнай адукацыі, на падтрымку навуковага супрацоўніцтва ў галіне псіхалогіі, абмен студэнтамі і выкладчыкамі ў мэтах стажыроўкі.

Л.А.Шамяткоў падкрэсліў тую значную ролю, якую адыгрывае Нацыянальная Асацыяцыя Сацыяльнай Дапамогі (АНПАС) і асабіста яе Прэзідэнт Лучыано Дземацеіс. У дадзеным накірунку многае робіцца і дабрачынным фондам "Дапамога дзецям Чарнобыля".

Пры адкрыцці сумеснай беларуска-італьянскай праграмы па стварэнню псіхалагічнай службы Гомельскай вобласці выступілі прэзідэнт АНПАС Лучыано Дземацеіс, старшыня фонда "Дапамога дзецям Чарнобыля" Г.В.Карэцкі. З уступнай лекцыяй выступіў прафесар Гаэтана Барлетта.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

ПЫТАЙЦЕ -- АДКАЗВАЕМ

## КОШТ ПАГАДЗІННАЙ АПЛАТЫ

Свае пасадавыя аклады выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта ведаюць пасля адпаведных роспісаў у аддзеле кадраў. А вось пагадзінная аплата вядома нямногім выкладчыкам. Таму пра яе памеры часта цікавяцца ў рэдакцыі нашай газеты. За растлумачэннем узнікаючых пытанняў мы звярнуліся ў планава-фінансавы аддзел. Як паведамілі нам, у адпаведнасці з пастановай Кабінета Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь з 1-га лістапада г.г. устаноўлена наступная пагадзінная аплата:

-- пры выкладанні ў школах і прафтэхвучылішчах для прафесара, доктара навук -- 3400 руб., дацэнта, кандыдата навук -- 3000 руб., для асоб, без вучонай ступені -- 2800 руб.;

-- пры выкладанні для студэнтаў -- адпаведна 4400, 4000 і 3200 руб.,

-- пры выкладанні для аспірантаў і слухачоў факультэта павышэння кваліфікацыі -- адпаведна 5600, 5000 і 4400 руб.

НА ТЭМЫ МАРАЛІ

# "СУМНА ЖЫЦЬ НА СВЕЦЕ, ПАНОВЕ..."

Крымінагенная сітуацыя сёння ў нашай рэспубліцы надзвычай складаная. Гомель, на жаль, выключэннем не з'яўляецца. Мы не застрахаваны ад кватэрных крадзяжоў, рабаўніцтва на вуліцах горада ў цёмны час, ад іншых непрыемнасцей, якія нам могуць паднесці злачынцы, у многіх выпадках узброеныя.

А ў апошні час па нейкаму супадзенню месцам здарэння розных непрыемных выпадкаў стаў наш універсітэт. Як кажуць, сярод белага дня ледзь не была згвалтавана ў жаночым туалеце на трэцім паверсе вучэбнага корпуса №1 адна з работніц біялагічнага факультэта. Мужчына-незнаёмец трапіў сюды без асаблівых цяжкасцей і, затаіўшыся, чакаў сваю ахвяру. Па шчаслівай выпадковасці здзейсніць свае намеры яму не ўдалося. Але гэты факт навёў на трывожны роздум і прымусіў прыняць адпаведныя меры. Цяпер у корпусе ўведзена дзяжурства выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў, каб выпадковыя людзі не маглі трапіць у сцены нашага універсітэта.

Больш асцярожнымі і разважлівымі трэба быць і жыхарам студэнцкіх інтэрнатаў, асабліва дзяўчатам, якія, на жаль, бываюць не вельмі разборлівымі ў сваіх знаёмствах. Часам гасцямі ў іх пакоях бываюць маладыя людзі, ад якіх усяго можна чакаць. Адсутнасць належнай пільнасці і ўвагі як з боку вахцёраў, якія не павінны прапускаць у студэнцкі дом каго папала з вуліцы, так і саміх жыхароў, прывяла, у прыватнасці, да надзвычайнага здарэння ў інтэрнаце на Валатаве. Пагражаючы нажом, нейкі незнаёмец адабраў у адной са студэнтак залатыя ўпрыгажэнні.

Ну, і кульмінацыяй гэтага ланцужку крыміналу стала сумна вядомае ўсяму гораду "мініраванне" корпуса №1, дзе 28 лістапада былі сарваны вучэбныя заняткі ў філолагаў. Зламыснік, верагодна, спадзяваўся на яго невыкрыццё праваахоўнымі органамі, а значыць, і на беспакаранасць. Адсюль і такое нахабства, страта пачуцця меры ў сваіх "жартачках".

Як тут не ўспомніць вядомыя радкі: "Сумна жыць на свеце, панове...", калі цынізм, злосць, варварства бяруць верх над дабром і прыстойнасцю. Не будзем жа моўчкі сузіраць гэта. Аглянемся навокал, і калі ў сценах універсітэта ўбачым сярод студэнтаў бескультур'е, якое мяжуе з хамствам, паставім іх на месца. Можа тады не будзем "пожинать плоды" іх нахабства -- выбітыя шыбы ў корпусе, абгарэлыя коўдры ў інтэрнаце пасля п'яных куражоў і г.д. Нельга закрываць вочы на вось такія паводзіны студэнцкай моладзі. Інакш нам ніколі не выбрацца з балота бездухоўнасці.

**Т.ДУБЯК.**



ТЭАТРУ МІНІЯЦЮР -- 10 ГАДОЎ

# "СТЭМ ПАМЁР, НЯХАЙ ЖЫВЕ СТЭМ!"

**Так адказаў на маё пытанне аб будучым СТЭМа адзін з яго ўдзельнікаў. Аднак аб усім па парадку. У канцы лістапада СТЭМ ГДУ адзначаў свой дзесяцігадовы юбілей. Для тых, хто не знаёмы або мала знаёмы са СТЭМам, крыху гісторыі.**

Студэнцкі тэатр эстрадных мініяцюр утварыўся ў пачатку 70-х гадоў, як група фізікаў-энтузіястаў, якія, падумаўшы, аб"ядналіся ў СТЭМ "Фіз-фак ГДУ". Нейкі час ён жыў і тварыў на базе фізічнага факультэта. У 1984 годзе атрымаў статус агульнауніверсітэцкага, і студэнцкі клуб "Маладосць" узяў яго пад сваё крыло. З тых часоў студэнты ГДУ, ды і не толькі яны, атрымалі магчымасць бачыць гэты калектыў на сваёй сцэне. Творчы росквіт СТЭМа прыпадае на 1990 г. Тады калектыў атрымаў Гран-пры на Міжнародным фестывалі СТЭМаў у Бранску, а потым былі 1991 г. -- Гран-пры на фестывалі ў Роўна і 1992 г. -- зноў Гран-пры тут жа. І вось 1993 г... -- 3 месца на фестывалі "Студэнцкая вясна" у Віцебску. Але гэта гісторыя, а цяпер давайце вернемся на юбілей СТЭМа.

Як павялося ў нашым універсітэце, у дзень юбілею "імянінікі" давалі канцэрт. Прыемна адзначыць, што ў гэтым канцэрце прынялі ўдзел і госці, якія прыехалі на свята сяброў. Гэта калектыў з Бранска "Квартал 311" і з Чарнігава "Стоп кадр праз коску" (а на наступны дзень яны давалі цэлы канцэрт, які праходзіў чамусьці не ў сценах нашага універсітэта, а БелДУТа). На жаль, на гэты цудоўны канцэрт змаглі трапіць толькі запрошаныя, а ён заслугоўваў таго, каб яго ўбачыць. Гэта быў сапраўдны аншлаг. Мне здаецца, ужо даўно канцэрт СТЭМа не заканчваўся такой моцнай авацыяй гледачоў.



Пасля такога поспеху мне, канешне ж, захацелася даведацца, што думае сам калектыў аб сваім юбілеі і сваім будучым. Па заканчэнні канцэрта мне давялося пагутарыць з Юрыем Капоцем, нязменным кіраўніком СТЭМа, і ўдзельнікамі.

*-- Юрый Іванавіч, вы кіруеце СТЭМам ужо 10 гадоў. Што змянілася за гэты час, ці стаў іншым СТЭМ?*

-- СТЭМ іншым не стаў, іншымі сталі людзі. Складаней стала працаваць. Калі перафразаваць вядомага пісьменніка, можна сказаць: "Людзі засталіся тымі ж, але іх сапсавала фінансавае пытанне". І тым не менш мы настроены аптымістычна.

*-- Гэта значыць, што пакідаць сцэну вы не збіраецеся?*

-- Так, канешне.

*-- І якія ў вас планы на будучае?*

-- Перш за ўсё, СТЭМ шукае спонсара, хаця б для фінансавання выязных канцэртаў, так як універсітэт у гэтым плане нам нічым дапамагчы не можа. А за тое, што гэты юбілей прайшоў, вялікае дзякуй нашым спонсарам, якія ўжо пералічылі нам грошы: СП "Бел Із" і рэкламнае агенцтва "Сов-Инфо" і тым, якія абяцалі іх пералічыць: фірме "Лен-Окс".

Такая размова адбылася ў мяне з кіраўніком, а вось ўдзельнікам СТЭМа я задала адно і тое ж пытанне:

*-- Гэты юбілей -- своеасаблівы вынік работы СТЭМа, якое будучае вы яму прадказваеце?*

І вось што яны мне адказалі:

**Сяргей Іваноў** /у СТЭМе з 1991 г./:

-- Нягледзячы на ўсялякія перамены як у лепшы, так і ў горшы бок, СТЭМ жыве, жыў і будзе жыць. Канешне, рэпертуар будзе мяняцца з цягам часу, але заўсёды прыемна ўспомніць мінулае і час ад часу вяртацца да ўжо любімых сцэнак. А аб калектыве -- я не ўяўляю сабе СТЭМ без Ю.Капоці.

**Аляксей Аўсеенка**/у СТЭМе з 1992 года/:

-- СТЭМ памёр, няхай жыве СТЭМ. Тыя, хто ведае, зразумеюць.

Вось такі цікавы адказ, і ўсё мае спробы дабіцца большага, поспеху не мелі.

У агульным меркаванні СТЭМаўцаў зводзіліся да аднаго:

-- Нягледзячы на ўсе ўнутраныя канфлікты, мы верым, што наш глядач зразумее нас і падтрымае ў канцы выступлення.

Вось на такой аптымістычнай ноце мне хацелася б закончыць гэта інтэрв"ю і выказаць спадзяванне, што ніякія цяжкасці не перашкодзяць студэнцкаму тэатру эстрадных мініяцюр "Сантэхэлектрамантаж" нашага універсітэта, яшчэ не раз парадаваць нас сваімі выступленнямі і канцэртамі.

**А.КАДОЛ,**
**студэнтка 2-га курса**
**гісторыка-юрыдычнага факультэта.**



**На здымках:**

(унізе) Ю.Трацэнка -- адзін з ветэранаў СТЭМа. Сваю любоў, творчыя здольнасці ён працягвае аддаваць гэтаму універсітэцкаму калектыву, хаця не з"яўляецца ўжо студэнтам ГДУ.

А без любімца публікі Лёліка Кастрылькіна СТЭМ уявіць проста немагчыма!

**Фота Ю.Капоці.**

# ПЕРАЛІК СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ І ЎСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАЎ НА ДЗЁННАЕ АДДЗЯЛЕННЕ ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ-95

У адпаведнасці з рашэннем савета універсітэта публікуецца пералік спецыяльнасцей і экзаменаў, па якіх будзе ажыццяўляцца прыём студэнтаў на дзённае аддзяленне ў будучым навучальным годзе /1995-1996 г.г./

| N | Спецыяльнасць | Экзамены |
|---|---|---|
| | 1. Руская мова і літаратура | 1. Руская мова /дыктант/<br>2. Руская мова і літаратура /вусна/<br>3. Беларуская мова і літаратура /вусна/ |
| | 2. Руская мова і літаратура і англійская мова | 1. Руская мова і літаратура / сачыненне/<br>2. Англійская мова /вусна/<br>3. Беларуская мова і літаратура /вусна/ |
| | 3. Руская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура | 1. Руская мова /дыктант/<br>2. Беларуская мова і літаратура /вусна/<br>3. Руская мова і літаратура /вусна/ |
| | 4. Беларуская мова і літаратура | 1. Беларуская мова /дыктант/<br>2. Беларуская мова і літаратура /вусна/<br>3. Руская мова і літаратура /вусна/ |
| | 5. Беларуская мова і літаратура і англійская мова | 1. Беларуская мова /дыктант/<br>2. Англійская мова /вусна/<br>3. Беларуская мова і літаратура /вусна/ |
| | 6. Англійская мова | 1. Англійская мова /вусна/<br>2. Гісторыя Беларусі /вусна/<br>3. Беларуская мова і літаратура /вусна/ |
| | 7. Нямецкая мова | 1. Нямецкая мова /вусна/<br>2.Гісторыя Беларусі /вусна/<br>3. Беларуская мова і літаратура /вусна/ |
| | 8. Матэматыка | 1. Матэматыка /вусна/<br>2. Матэматыка /пісьмова/<br>3. Беларуская мова і літаратура /вусна/ |
| | 9. Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт | —/— |
| | 10. Эканамічная інфарматыка | —/— |
| | 11. Эканоміка і кіраванне вытворчасцю | —/— |
| | 12. Прыкладная матэматыка | —/— |
| | 13. Фізіка /вытворчае і педагагічнае аддзяленні/ | 1. Фізіка /вусна/<br>2. Матэматыка /пісьмова/<br>3. Беларуская мова і літаратура /вусна/ |
| | 14. Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі | —/— |
| | 15. Геалогія і разведка карысных выкапняў | —/— |
| | 16. Гісторыя | 1. Гісторыя Беларусі /вусна/<br>2. Замежная мова /вусна/<br>3. Беларуская мова і літаратура /вусна/ |
| | 17. Гісторыя і англійская мова | 1. Гісторыя Беларусі /вусна/<br>2. Англійская мова /вусна/<br>3.Беларуская мова і літаратура /вусна/ |
| | 18. Гісторыя і нямецкая мова | 1. Гісторыя Беларусі /вусна/<br>2.Нямецкая мова /вусна/<br>3. Беларуская мова і літаратура /вусна/ |
| | 19. Правазнаўства | 1. Гісторыя Беларусі /вусна/<br>2. Матэматыка /вусна/<br>3. Замежная мова /вусна/<br>4. Беларуская мова і літаратура /вусна, пазаконкурсны экзамен/ |
| | 20. Геаграфія | 1. Геаграфія /вусна/<br>2. Замежная мова /вусна/<br>3. Беларуская мова і літаратура /вусна/ |
| | 21. Геаграфія і англійская мова | 1. Геаграфія /вусна/<br>2. Англійская мова /вусна/<br>3. Беларуская мова і літаратура /вусна/ |
| | 22. Геаграфія і і нямецкая мова | 1. Геаграфія /вусна/<br>2.Нямецкая мова /вусна/.<br>3. Беларуская мова і літаратура /вусна/. |
| | 23. Біялогія і хімія | 1. Біялогія /вусна/<br>2. Хімія /вусна/<br>3. Беларуская мова і літаратура /вусна/ |
| | 24. Фізічная культура і спорт /аддзяленні спартыўнага ўдасканалення/ | 1. Экзамен па спецфізпадрыхтоўцы<br>2. Біялогія /вусна/<br>3. Беларуская мова і літаратура /вусна/<br>4. Плаванне /пазаконкурсны экзамен/ |

P.S. Аб магчымых змяненнях будзе паведамляцца.

КАНФЕРЭНЦЫЯ

## ТЭРМІНАЛОГІЯ І НАВУЧАЛЬНЫ ПРАЦЭС

На філалагічным факультэце прайшла Рэспубліканская канферэнцыя "Пытанні нармалізацыі беларускай навуковай тэрміналогіі". Арганізатарам яе выступіла кафедра беларускай культуры. На канферэнцыю прыехалі навукоўцы са сталіцы і Віцебска.

Цікавасцю вызначаліся даклады выкладчыкаў Мінскага дзяржаўнага універсітэта электронікі і радыётэхнікі дацэнтаў Т.Сухой, Л.Шломы, В.Юферава, якія ўжо чатыры гады выкладаюць у гэтай навучальнай установе выключна тэхнічнага профілю розныя матэматычныя курсы на беларускай мове. Дарэчы, яны шмат працуюць над удасканаленнем матэматычнай тэрміналогіі, склалі і выдалі матэматычны слоўнік для сярэдняй школы.

Аб выкладанні філасофскіх дысцыплін на роднай мове ў політэхнічнай акадэміі гаварыў дацэнт М.Анцыповіч. Гэтыя і іншыя даклады навукоўцаў выклікалі ажыўленую дыскусію, якая працягвалася на другі дзень па праблемах развіцця беларускай мовы і выкладання на ёй. Удзельнікі канферэнцыі з вялікім задавальненнем наведалі Веткаўскі музей народнай творчасці.

Шкада, што да названай канферэнцыі абыякава паставіліся выкладчыкі нашага універсітэта. На нашу думку, ім не пашкодзіла б паслухаць тых, хто мае вопыт выкладання спецыяльных дысцыплін на дзяржаўнай мове.

Л.КУЗЬМІЧ,
дацэнт кафедры бедарускай мовы.



ЯК АПРАНУЦЦА ПА-СУЧАСНАМУ

## МОДА: СТЫЛЬ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ




На двары, на жаль, не ўсё так, як хацелася б... Вось менавіта зараз шэрасць і халады, здавалася б, выціснулі ўсё цікавае і прыемнае для вачэй з нашага гардэроба, і мы хочам прапанаваць вам невялікі экскурс у свет прыгожай жаночай моды.

Нашыя фінансавыя цяжкасці наўрад ці дазволяць усім нам апрануцца так, як раяць мадэльеры "высокай" моды. Але не бяда! Ёсць яшчэ шмат мадэляў і мадэльераў, якія працуюць на так званага "сярэдняга" кліента.

Для прыгожай паловы чалавецтва зноў вяртаюцца ў моду капелюшы, прычым самыя разнастайныя: гэта можа быць і "рэтра", і стыль "класік", і традыцыйныя капелюшы з невялікімі, злёгку загорнутымі палямі. Паступова пачынаюць вяртацца берэты, прычым самай рознай канфігурацыі і памераў. Ну, і калі ўжо размова зайшла аб іх, трэба сказаць аб тым, што цудоўна ў ансамблі з берэтам выглядаюць самыя разнастайныя ўпрыгожванні: брошкі, падвесы, ланцужкі, розныя дэкаратыўныя банты з парчы і аксаміту.

З абутку па-ранейшаму ў модзе "казакі" і ўсё шырэй пачынаюць заваёўваць сабе папулярнасць невысокія чаравікі і боты з акантоўкай з футры. Паступова выцясняюцца з моды высокія батфорты са шнуроўкай. Для халоднага надвор"я проста неабходна паліто злёгку прыталенага сілуэта спакойных, някідкіх таноў без залішніх упрыгожванняў. Адной з адметных рыс моды гэтага сезона з"яўляюцца асабліва падкрэсленая элегантнасць і класічны стыль у верхняй вопратцы.

Жаночыя сукенкі, жакеты і блузы павінны быць пераважна пастэльных, бардовых, ультрамарынавых або балотных таноў. І, канешне, фаварытам па-ранейшаму з"яўляецца колер "марской хвалі".

Асобна хацелася б адзначыць асаблівасці жаночых спадніц: побач з вечнай дэмакратычнасцю адносна даўжыні /гэта могуць быць як міні, так і максі/, некалькі слоў хацелася б сказаць аб пакроі. Перавага аддаецца спадніцам сярэдняй даўжыні, агульная заканамернасць такая, што гэты сезон характарызуецца двумя асноўнымі характарыстыкамі: сярэдняя даўжыня і злёгку завужаны сілуэт да нізу.

А наогул у модзе, як і ў папярэднім сезоне,-- шмат колераў і адценняў. І ўсё ж, нягледзячы на сумятню колераў і пакрою, упрыгожванняў і атрыбутаў, агульная тэндэнцыя моды -- тая ж, што і некалькі гадоў назад: мода гаворыць "не" безгустоўнасці і дае шырокую дарогу асабістаму падыходу ў выбары свайго непадражальнага і індывідуальнага стылю.

П.БЕСЯЦКІ,
вядучы рубрыкі"Лідэр".

ФАН-КЛУБ

## АШАЛАМЛЯЛЬНЫ "ДЭБЮТ" Б'ЁРК

"Музыка -- гэта адна з самых галоўных рэчаў у жыцці, як ежа, сон, каханне. Песня можа вырашыць многія асабістыя праблемы. Гэта праўда: калі вы пачуеце патрэбную песню ў патрэбны час, вы зможаце вырашыць пытанне, якое ўжо даўно сядзіць у вас у галаве, пытанне, якое не знікне нават пасля самай шчырай гутаркі з самым лепшым сябрам. А я ўмею спяваць".

Цудоўныя словы, ці не праўда? Належаць яны, бадай, самай неардынарнай на сённяшні дзень зорцы, якая не так даўно з"явілася на музычным небасхіле Захаду. У гэтай ісландскай дзяўчынцы ўсё дзіўнае: і голас, і знешнасць, і тое, як яна сябе паводзіць на сцэне, і нават імя...Паспрабуй вымаві з першага разу -- Б"ёрк Гудмундсдоцір. Не дзіўнай аказалася толькі назва яе першага сольнага альбома -- "Дэбют", -- які азнаменаваў нараджэнне новай суперзоркі 90-х. Адразу пасля выхаду ў свет пласцінка трапіла ў першыя радкі хіт-парадаў па ўсёй Еўропе. Амерыканцы таксама ацанілі талент спявачкі, удастоілі яе сваёй найвышэйшай музычнай узнагароды --- "Грэмі" /у намінацыі "Адкрыццё года"/. Такі поспех "эскімоскага эльфа", як ахрысціла Б'ёрк музычная прэса, выліўся ў самае сапраўднае свята для маленькай Ісландыі. "Вы нават не ўяўляеце, колькі віншавальных тэлеграм я атрымала ад нашых палітычных дзеячоў, -- расказвае Б'ёрк. -- Апошні раз Ісландыя перажывала такі прыступ нацыянальнага гонару некалькі гадоў назад, калі наша дзяўчына выйграла залаты медаль на Алімпійскіх гульнях для інвалідаў."

Нягледзячы на тое, што ў апошні час у прэсе дастаткова часта з"яўляюцца інтэрв"ю з Б"ёрк, вядома аб ёй няшмат. У шоу-бізнесе яна больш дзесяці гадоў, за час гастроляў са сваёй ранейшай групай "Шугакьюбз" пабывала практычна ва ўсіх частках свету. У яе ўжо сын - школьнік. Цікава такая заява спявачкі: "Я ведаю толькі адно: маё імя Б'ёрк, і я з Ісландыі. Усё астатняе пра мяне пакрыта для мяне самай глыбокай цемрай". Не меншай цемрай пакрыта і яе музыка, якую, на думку Б'ёрк, "трэба слухаць не вушамі, а грудзямі, жыватом, вантробамі". Напэўна, у гэтым ключ да разумення супярэчлівага ўнутранага свету спявачкі.

Як бы там ні было, а Б'ёрк не з тых, хто сядзіць склаўшы рукі. Будзем спадзявацца, што ў хуткім часе і беларускія меламаны пазнаёмяцца з яе новай работай -- рэміксамі з альбома "Дэбют".

В.БОРТНІК,
студэнт 4-га курса філалагічнага факультэта.



Археалагічная практыка -- раскопкі старажытнага Гомеля. На першым плане студэнты-гісторыкі А.Белякоў і Д.Рабцаў даследуюць рэшткі пабудовы XIV-XV стагоддзяў.
Фота А.Макушнікава.

## АДКРЫТАЕ АКЦЫЯНЕРНАЕ ТАВАРЫСТВА "СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫ ІНВЕСТЫЦЫЙНЫ ФОНД, ЯКІ АКУМУЛЮЕ ІМЯННЫЯ ПРЫВАТЫЗАЦЫЙНЫЯ ЧЭКІ "МАЁМАСЦЬ" ААТ СІФ "ГЕНЕРАЛЬНЫ"

**АБ'ЯЎЛЯЕ**

аб продажу сваіх акцый другой падпіскі за грашовыя сродкі і прыватызацыйныя чэкі "МАЁМАСЦЬ".

Аб'яўлены ўстаўны капітал фонда -- 1.000000000 /1 млдр./ руб.

Намінал акцыі -- 2500 /дзве тысячы пяцьсот/ руб.

Прадметам дзейнасці таварыства з'яўляецца прыцягненне грашовых сродкаў грамадзян і юрыдычных асоб, а таксама і імянных прыватызацыйных чэкаў з мэтай інвесціравання сродкаў у каштоўныя паперы іншых імітэнтаў, а таксама ўкладу іх у банкі.

Таварыства выпускае простыя акцыі. Продаж акцый пачынаецца з дня апублікавання дадзенай інфармацыі, заверанай Дзяржінспекцыяй па каштоўных паперах. Памер дывідэнда вызначаецца агульным сходам акцыянераў і выплачваецца штогод.

Набыць акцыі ААТ СІФ "Генеральны" і азнаёміцца з праспектамі эмісіі і іншымі дакументамі фонда можна штодзённа, акрамя выхадных дзён, па адрасу:

г.Гомель, вул. Савецкая, 87, п.226.


## СПОРТ ПРЫ МАСАВЫМ УДЗЕЛЕ

26-га лістапада -- ў дзень 51-й гадавіны вызвалення Гомеля ад фашысцкіх захопнікаў -- адбыўся абласны лёгкаатлетычны прабег, прысвечаны гэтай знамянальнай даце. Надвор"е было неспрыяльным. І ўсё ж на старт выйшла шмат аматараў бегу. Прыемна адзначыць, што выставілі сваіх прадстаўнікоў і ўсе факультэты нашага універсітэта -- звыш 100 чалавек. У агульнакамандным заліку па групе ВНУ нашы лёгкаатлеты сталі пераможцамі.

## ПРЫЗЁР ПЕРШЫНСТВА ЕЎРОПЫ

Праведзена першынство Еўропы па дзюдо сярод моладзі. Паспяхова выступіла каманда Рэспублікі Беларусь. Яе гонар абараняў і трэцякурснік факультэта фізічнай культуры і спорту нашага універсітэта майстар спорту Рашад Мамедаў /трэнер В.А.Унучкін/. Ён заняў трэцяе месца і заваяваў бронзавы медаль.

## ВЫКАНАЎ ЗАПАВЕТНЫ НАРМАТЫЎ

У Магілёве праведзены міждзяржаўны турнір па вольнай барацьбе. У ім прыняў удзел і выхаванец факультэта фізічнай культуры і спорту нашага універсітэта Дзмітрый Захарчанка /трэнер А.У.Хатылёў/. Ён паспяхова праводзіў свае паядынкі і здолеў выканаць норматыў майстра спорту.

**Д.ЖАРКОЎ,**
дырэктар спартыўнага клуба.

**УВАГА! УВАГА! УВАГА!**

## АБ НАВАГОДНІМ ВЕЧАРЫ

Прафком і адміністрацыя універсітэта праводзяць 29 снежня г.г. вечар выкладчыкаў і супрацоўнікаў, прысвечаны Новаму, 1995 году. За даведкамі па ўсіх пытаннях звяртацца ў прафком да 15 снежня па тэл. 57-19-22.

◆ ◆ ◆

Прафком просіць прафоргаў усіх структурных падраздзяленняў універсітэта да 15 снежня падаць спісы дзяцей да 12-гадовага ўзросту для набыцця ім навагодніх падарункаў.

**ПРАФКОМ.**

## ЖЫЦЦЁ ЯК ЯНО ЁСЦЬ



Перафразуючы вядомы радок:
"Па вуліцы быка вадзілі..."

Фота У.Чысціка

ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ

аб"яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- гісторыі ўсходнеславянскіх народаў -- асістэнта;
-- геаграфіі -- старшага выкладчыка;
-- фізвыхавання -- старшага выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней аднаго месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**


Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

"Гомельскі універсітэт" -- газета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул, Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты -- Цэнтральны райсавет народных дэпутатаў г. Гомеля; НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, адрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук".

Рэдактар
Ул. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 719

Падпісана да друку 9.12.94.